Antrieb ihr Land verlassen, gelten als "Migranten". Menschen, die einen Asylantrag gestellt haben, über den noch nicht entschieden wurde, werden als "Asylbewerber" bezeichnet. Das Bundesamt für Migration und Flüchtlinge (BAMF) bearbeitet ihre Anträge individuell. Die Asylbewerber müssen schildern, wie und warum sie verfolgt werden. Das Amt beurteilt, ob ein Bewerber asylberechtigt ist, ob er den Flüchtlingsstatus erhält oder ob ihm beides verweigert wird.

**Schlussfolgerung**. Viele Deutschen meinen, fast alle Flüchtlinge sind kriminell. Seit Monaten geht eine Angst in Deutschland um. Eine Angst vor Afrikaner Banden, die herumziehen, stehlen, Drogen verkaufen und die Frauen zwingen. Ist es wirklich so, dass dort, wo Flüchtlinge hinkommen, Kriminalitätsrate in dieser Gegend ansteigt. Insgesamt sagt die Polizei „Nein“, das ist definitiv nicht so. Aber die Polizei spricht auch von Problemen, die in den Medien nur sehr selten auftauchen. Und da gibt es 2 Haupt Probleme. Das erste Problem ist, dass in den Flüchtlingsunterkünften hunderte Menschen aus verschiedensten Nationen, Kulturkreisen und Religionen auf engsten Raum zusammengepfercht werden und das über viele Wochen lang. Das wird natürlich ein Potential für Konflikte, Gewalt und unter anderem deshalb muss die Polizei häufig bei Flüchtlingsunterkünften vorbeischauen. Das zweite Problem sind die MUFLs (Minderjährige unbegleitete Flüchtlinge). Das sind die Kinder, die ohne Eltern, ohne Begleitung hierher kommen und dringend betreut werden müssen. Aber das passiert nicht immer so wunderbar. Ein klares Beispiel ist Unterkunft in Mittelangeln.

Natürlich gibt es Kriminalität unter den Flüchtlingen. Teilweise kommen auch Kriminelle als Flüchtlinge. Der große überwiegende Teil der Flüchtlinge ist nett, höfflich und fühlt sich hier in Deutschland sehr wohl.

Literaturverzeichnis


1. Duden. Deutsches Universalwörterbuch / Dr. W. Scholze-Stubenrecht. – 8. – bearbeitete und erweiterte Auflage. – Berlin : Dudenverlag, 2015. – 2128 S.


## НАЦЫЯНАЛЬНА МАРКІРАВАНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ВЕРСЭТАХ АЛЕСЯ РАЗАНАВА


*Дубоўская Т.А.*
*Віцебск, Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»*


Многія версэты Алеся Разанава ўяўляюць сабой адлюстраванне глабалізаванага, крызіснага свету, у якім апірышчам, «святлом у канцы тунэля» выступаюць вобразы з яскравай нацыянальнай канцэптуальнасцю.

Мэта працы – даследаваць у версэтах А. Разанава змест вобразаў з нацыянальна-беларускай семантыкай.

**Матэрыял і метады.** Навуковае даследаванне праведзена на аснове дэскрыптыўнага і канцэптуальнага аналізу версэтаў А. Разанава.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Аднымі з ключавых вобразаў у версэтнай паэзіі А. Разанава выступаюць вобразы рэчаў. Можна сказаць, што дадзенымі вобразамі маркіравана ўся творчасць паэта. «Рэчыўная» паэзія А. Разанава мае асаюлівыя рэчаісныя адносіны, разначасовую выразнасць, характырызуюцца самадастатковасцю – адлюстровываюць адносіны да свету, по новаму адкрывае яго чалавеку. У адрозненне ад вершаказаў, у якіх А. Разанаў раскрывае этымалогію найменняў рэчаў, вылучае асаблівасці іх гучання у розных мовах, надае вялікае значэнне ўнутранаму сэнсу слоў, асацыятыўным сувязям, што ўзнікаюць між імі, у версэтах аўтар па-філасофску асэнсоўвае само паняцце «рэчы».

У творчасці беларускага лірыка рэчы выступаюць сімвалам духоўнай сувязі чалавека са сваім каранямі. У версэце «Маленькія ночвы» ў іншасказальным аповедзе лірычнага героя ночвы асацыююцца з маленствам: *«Нехта стукае ў дзверы. / Я доўга, не ведаючы, хто гэта стукае, не адчыняю, а калі адчыняю, бачу: стаіць за дзвярыма бацька з маленькімі ночвамі ў руках. / Ён кажа: “Пакуль ты мне адчыняў, я схадзіў пад царкву і ўзяў вось гэтыя ночвы, каб імі стукацца ў дзверы. / Ці помніш ты гэтыя ночвы: ты ў іх купаўся, калі быў малым…”»*. Вобраз бацькі ў творы невыпадковы. Ён як старэйшына сям’і, стукаючыся ночвамі ў дзверы, нібы дае запавет сыну: ніколі не забываць сваіх продкаў, сваю радзіму. Маленькія ночвы – сімвал сакральнасці, памяці пра сябе самога: *«Я гляджу на маленькія ночвы і, нібы ўва мне адчыняюцца нейкія дзверы, у іх пазнаю, што і помніць не помню, што згадваць не згадваю і што не мае ні вобразу, ні наймення, а мае мяне самога, – / сваё»*. Дзверы, якія нібы адчыняюцца ў лірычным героі, сімвалізуюць сабой азарэнне, прасвятленне душы, духоўнае navяртанне да сваіх каранёў.

Тэматычна блізкім да вышэйназванага версэта з’яўляецца верш «Парог», у якім памяць аб продках увасоблена ў парозе, высечаным калісьці іх рукамі: *«Парог урос у зямлю, струхлеў… / <…> / Але гэткі ён толькі зверху, далей ён трывалы, далей ён моцны – і шашаль яго не стачыў, і цвіль яго не збуцвіла. / <…> / Мы не ўваходзім у хату: у ёй жылі нашы дзяды, у ёй жылі прадзеды нашы, а мы стаім на парозе, на шчырым парозе, і адчуваем, што мы гэтаксама парог, да якога – няма нас, і пасля якога – няма…»*. Парог у версэце набывае канатацыю сучаснасці, якая злучае мінулае і будучае.

Яшчэ адным моцным нацыянальна маркіраваным вобразам з’яўляюцца кладкі («Кладкі»). Гэта вобраз, што сімвалізуе духоўныя арыенціры, апору ў складаны і вызначальны для беларускага народа час: *«Некалі па дрыгве былі пакладзены кладкі, і людзі тады разумелі, куды жывуць, але даўно ўжо кладкі ўбіліся ўглыб, засмакталіся прагнай дрыгвою, і трэба цяпер ісці наўздагад»*. Канцэпт «дрыгва» даволі распаўсюджаны ў беларускай літаратуры. Даследчыкі адзначаюсь яго выразную нацыянальную

маркіраваннасць для нашага этнасу. Так, напраклад А.С. Івашчанка адзначае, што ў ў версэце «Кладкі» дрыгвянное бязмежжа есць выразнік аднаго з магчымых шляхоў да лепшага, бо гэта у дрыгвоце адшукваецца нацыянальны генетычны код – аснова нашай самасвядомасці. Кладкі – сімвал «нацыянальнай памяці, глыбінных, нават генетычных пластоў свядомасці» [1, 99]: *«Мы гразнем, мы сумняваемся, мы вывяраем крокі, і калі раптам правальваемся ў згубную глыбіню, знаходзім, гэтак жа раптам, апірышча – страчанае, старое,аднятае, але ўсё роўна заўсёды прысутнае патаемна ў нашых адчайных памкненнях, – кладкі»*. У гэтым сэнсе, драгвота – не столькі шлях захавання этна-культурных адметнасцей, колькі крыніца невычарпальная народнай мудрасці.

Сутнасць сапраўднага лірыка часта пазнаецца па выбары асноўных топасаў, якія становяцца дамінантнымі ў яго творчасці. У паэзіі А. Разанава такім топасам з’яўляецца горад, ён жа адначасова выступае і канцэптуальна-нацыянальным вобразам. Так, версэт «Стары горад» уяўляе сабой рэтраспекцыю ў мінулае горада, «аблічча» якога сцёр час, але ў якім тоіцца дух таго жыцця, што было тут раней. Таямнічасць, загадкавасць у апісанні горада набліжаюць версэт А. Разанава да своеасаблівай прыпавесці: *«На аціішэлых падворках, ля гонты і чарапіцы, квітнее ружовы і белы бэз і асвятляе сваім цвіценнем, сваім разуменнем горад, што паглыбляецца ў даўніну. / <…> / Пакінулі апошнія жыхары свае дамы-мураванкі, свае драўляныя хаты з аканіцамі і ліштвой і ўсё, што мелі, што нажывалі, што памяталі, што снілі, пабралі ў пярэбары, у перасяленне, у новы кут…»*. Урбанізацыя для Беларусі была не толькі непазбежнай умовай прагрэсу і самім гэтым прагрэсам, але і асіміляцыяй у рускамоўным асяроддзі, ментальнай драмай для дзясяткаў тысяч тых сялян – захавальнікаў традыцый, мовы, – што прыехалі працаваць на гарадскія заводы і жыць у заводскіх інтэрнатах. Горад быў актыўным «рухавіком» правядзення русіфікацыі карэннага беларускага насельніцтва. Неспакоем, трывогай пра пакінутае роднае, дзіцячым плачам «поўніцца» апісанне горада: *«Тут раптам зазвоняць званы трывожна, / зацокаюць раптам падковы па бруку, / раптам дзіця заплача… / <…> / Тут нешта тоіцца, нешта хаваецца, нешта ўхіляецца ад разгляду… / Падводзіцца да старога горада вузкакалейка. / Па старым горадзе ходзяць узброеныя патрулі»*. Сімвалічны сэнс мае ў творы вобраз узброеных патрулёў. Гарадская варта сімвалізуе ўнутраную сілу, якая змушае чалавека пакарыцца, падпарадкавацца агульнаму «парадку», стаць «як усе», прыняць аблічча гарадскіх мас.

Яшчэ адным значным топасам у паэзіі А. Разанава выступае лес. Так, у версэце «У лесе» аўтар параўноўвае чалавечы лёс з лесам, у якім лірычны герой імкнецца сябе адшукаць: *«У лесе дрэвы і людзі: той, хто стаіць нерухома на месцы, – дрэвы, той, хто блукае, – людзі. / <…> / А таямніца ў самай сярэдзіне нетраў трымае відушчы ліхтар. / Куды б ні ішоў – я вяду за сабою лес. / Дзе б я ні быў – застаюся ў лесе. / Лес – лёс»*. Лес – адзін з

нашых лёсавызначальных архетыповых топасаў. Яшчэ ў язычніцкія часы нашы прашчуры будавалі ў лесе жытло, лес дапамагаў выжыць ім у суровых прыродных умовах. Разам з тым лес заўжды захоўваў у сабе пэўныя таемныя, містычныя сілы. Звязана гэта з анімізмам – верай нашых продкаў у існаванне духаў, адухаўленнем імі разнастайных сіл прыроды, расліннага і жывёльнага свету. Адсюль – распаўсюджаны ў беларусаў культ дрэў (дуб, бяроза, вярба), атаясамліванне дуба з Сусветным Дрэвам, вера ў лясных духаў (лесуна, багніка, змяінага цара, купальскага дзядка, расамаху і інш.). Топас лесу часта сустракаецца ў нацыянальным фальклоры (песнях, замовах, паданнях) і мастацкай літаратуры. Такім чынам, праз асэнсаванне сябе і лесу аўтар сцвярджае філасофскую думку пра непарыўнасць чалавека са светам, з гістарычным лёсам свайго народа.

**Заключэнне.** Версэты А. Разанава – гэта адлюстраванне крызіснага свету, у якім чалавек страчвае, але і набывае сэнс свайго жыцця. Апошні сакралізуецца ў вобразах з маркіраваным нацыянальна-культурным зместам. Праз аўтарскія канцэптуальныя вобразы парога, кладак, дзвярэй, ночваў, дрэва, горада чытач засвойвае наступную ідэю: чалавек можа знайсці сваю цэласнасць выключна на грунце этнічным, нацыянальным.

Спіс літаратуры

1. Івашчанка, А. С. Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй : манаграфія / А. С. Івашчанка. – Мінск : БНТУ, 2008. – 144 с.

## IMPROVING THE ACTIVITIES OF LOCAL SELF-GOVERNMENT AUTHORITIES IN THE REPUBLIC OF BELARUS

*Elenskaya A.A., Ivanova T.P., Sasnouskaya A.V.*
*Vitebsk, Vitebsk branch of the International University "MITSO"*

In many countries, local self-government has gained significant political weight, has become a real factor in social development, and an important area of public life. Countries have accumulated considerable practical experience in dealing with local self-government issues. At the same time, there are still a number of problems in the activities of local self-government authorities.

The purpose of the work is to specify the tasks for improving the activities of local self-government authorities in the Republic of Belarus.

**Material and methods.** The research is based on the legislation on regional development. Research methods are analysis, synthesis, generalization, and a historical-legal and comparative-legal method.